**Траяновіч Д.Ю.,** студэнтка 411 гр.
Навуковы кіраўнік – Бабко А.І.

# АЛЬБЕР КАМЮ ЯК СТВАРАЛЬНІК МАСТАЦКАГА КОДА ЭПОХІ

*І паклаў я сэрца маё на тое, каб зведаць разумнае і зведаць вар'яцтва і тлум; зведаў, што і гэта — пакута духу. Таму што ў вялікім розуме шмат смутку; і хто памнажае веды, памнажае тугу.*

Екк 1; 17, 18

Ці варта жыццё таго, каб жыць?

Вонкавыя веды не могуць быць прычынай самазабойства. Яно спее на нашым баку свядомасці.

Спачатку чалавек набывае звычку жыць, толькі пазней — мысліць. І як толькі ён пачынае мысліць, узнікае сумненне ў тым, што асабістае штодзённае жыццё, маючы вонкавыя прыкметы логікі, лагічна цалкам. Паўстае пачуццё абсурду, адсутнасці канчатковай мэты [2, с. 19]. Дык навошта жыць? Але Сусвет такі вялікі і так абыякава ставіцца да нашага існавання, што проста не заўважыць нашага сыходу, так што самазабойства — кепскае рашэнне.

Не варта чакаць, што сусвет пусціць слязу ад таго, што хтосьці з нас ляжыць у прыгожай труне ў акружэнні няўцешнага натоўпу сваякоў, сяброў ды іншых зацікаўленых асоб. Для нас гэтага ўжо не будзе. Так што не будзем спяшацца ў камору за шворкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мы не зрабілі нічога, каб з‘явіцца на гэтым свеце, дык чаму мы лічым, што маем права спыніць існаванне, якое нам не належыць?

Натуральным чынам з‘яўляецца асэнсаванне таго, што ў кожнае імгненне часу чалавек знаходзіцца ў пэўнай кропцы, якая на імгненне бліжэй да немінучай смерці. Час — наш вораг. Асэнсаванне часу і канчатковасці існавання і ёсць абсурд, і наша рэакцыя ў адказ — не больш чым панічны жах, бунтарства плоці, якая раптоўна ўцяміла непазбежнае.

Абсурд аднолькава залежыць і ад Сусвету і ад чалавека. Ён — адзіная сувязь паміж імі.

Ірацыянальнасць, чалавечая настальгія і народжаны пад час іх сустрэчы абсурд — вось тры персанажы драмы, якую неабходна прасачыць ад пачатку да канца з усёй логікай, на якую здольная экзістэныя. Па сутнасці, абсурд — гэта раскол. Яго няма ні ў адным з элементаў для параўнання. Ён нараджаецца ў іх сутыкненні.

Чалавечае сэрца як прыстанак абсурду: голас плоці, пяшчота, творчасць, дзейнасць, высокародная веліч зноў зоймуць свае месцы ў гэтым вар‘яцкім свеце. Чалавек знойдзе ў ім віно абсурду і хлеб абыякавасці, (інтэртэкстуальная сувязь з хрысціянскімі таінствамі) якія сілкуюць яго веліч. Жыць — значыць абуджаць да жыцця абсурд. Абуджаць яго да жыцця — значыць неадрыўна вымяраць яго вокам.

Пастаянны бунт — адзінае, што падтрымлівае існаванне чалавека.

**Свабода ўвогуле** не цікавіць. Толькі асабістая імгненная свабода. Звычайны чалавек плануе жыццё, як быццам ён вольны, але менавіта гэтыя планы яго і няволяць.

Калі я прымаю, што мая свабода мае сэнс толькі ў адмераных лёсам межах, то вымушаны адзначыць: у залік ідзе не лешае, а доўгае жыццё.

Свядомыя адносіны да жыцця на працягу найдаўжэйшага часу — вось сэнс існаўння абсурднага чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сізіф вымушаны намагацца без мэты. Гэта плата за зямныя пачуцці.

Гэта яшчэ не ўсё, яшчэ не ўсё вычэрпана. Лёс — справа чалавека, справа, якая павінна вяршыцца сярод людзей. У гэтым журботная радасць Сізіфа. Яму належыць яго лёс. Камень — яго здабытак. Адной барацьбы за вяршыню дастаткова, каб запоўніць сэрца чалавека. Сізіфа варта ўяўляць шчаслівым.

Дарэчы узгадаць прыказку пра спосаб існавання салдата тэрміновай службы, які дарэмна працуе рыдлёўкай: «Бяры болей, кідай далей. Пакуль ляціць — адпачынак».

Чалавецтва ў сукупнасці адчувае абсурднасць свайго існавання, таму раз-пораз здзяйсняе спробу самагубства праз войны. Але логіка абсурду гэтаму пярэчыць і не дае суіцыду здзейсніцца.

Свабода — сіроцтва, рабства — правільнае дзяцінства. Народ — дзіцяці, улада — бацькі. На волі страшна, трэба прымаць уласныя рашэнні і за іх адказваць.

Камю цяжка аднесці да пэўнайфіласоўскай плыні, бо ён ні ў якім разе не з‘яўляецца «сістэматычным» філосафам [3, с. 97]. Тым не менш яго творчыя пошукі і знаходкі дазваляюць зрабіць выснову пра яго блізкасць да экзістанцыялізму.

Экзістэнцыялісты даследуюць знітаванасць грамадства і асобы. Грамадства праз масавыя камунікацыі пазбаўляе чалавека яго ідэнтычнасці, вымушае быць сацыяльным нявольнікам.

М. Хайдэгер: Чалавек — сацыяльны робат. Кожны ёсць іншы, і ніхто ён сам. Чалавек пад уздзеяннем грамадства, у першую чаргу праз адукацыю, губляе сваю індывідуальнасць. Тут хацелася б саслацца на фільм А. Паркера «Мур».

Ф. Дастаеўскі. Ідэя супрацьстаяння грамадству. Даследаванне памежнага стану душы перад тым, як вырашыць здзейсніць забойства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ж.П. Сартр. Расказ «Мур». Асэнсаванне смерці — шлях да аэнсавання сапраўднасці жыцця [1, с. 35].

Сусвет непазнавальны. Да чалавека ён не мае ніякіх адносінаў. Спроба злучыць Сусвет і Чалавека вядзе да распаду. Гэта і ёсць адна з іпастасяў абсурду, які іх усё ж такі злучае.

Будучыня не мае сэнсу. Яе не будзе. Як толькі яна настае, адразу робіцца цяперашнім. Спроба асэнсаваць (ці змяніць) былое разбурае рэчаіснасць.

Абсурд — немагчымасць зразумець Сусвет і іншага чалавека. Нішто, ніхто і ніколі не набудзе падабенства да нас.

Пераадоленне абсурду — бунтарства думкі ў кожны момант часу. Нязгода з жыццём, абставінамі, нават самім сабой. Рэакцыя на жыццё не так, як яно чакае. Адказ ад натуральных для грамадства рашэнняў.

А. і Б. Стругацкія. «Цяжка быць богам». Панаванне Шэрых зменіцца панаваннем Чорных, з якімі толькі адзіны спосаб барацьбы — ахвяраваць сабой у іх на віду. (Новы Запавет). На фатальных ростанях гісторыі звычайнага гуманізму мала…

Хронапесімізм В. Быкава: вобраы і лёсы прадстаўнікоў наступнага пакалення ў позніх творах пісьменніка («Кар‘ер», «Аблава», «Балота»).

У. Сарокін. Зборнік апавяданняў «Першы суботнік».

Каханне як катэгорыя абсурду ў п‘есе І. Вырыпаева «Выявы» («Иллюзии»).

Каштоўнасць творчасці А. Камю ў тым, што спроба яе асэнсавання дае магчымасць пашырыць светапогляд, выйсці па-за межы банальнасці, адчуць невядомыя раней рытмы і рыфмы.

---

1. Сартр, Ж.-П. Мур / Ж.-П. Сартр. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1991. – 230 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Camus, A. Le mythe de Sisyphe / A. Camus. – Paris: Gallimard, 1985/ - 187 P.

3. Monar, J. Albert Camus / J. Monar // Philosophie der Gegenwart in Einzeldarstellungen. Von Adorno bis von Wright. – Sfiffdart: Alfred Kroner Verlag, 1991. – S. 93 – 97.

**Троянович Д.Ю.,** студентка 411а гр.

Научный руководитель Калашникова А.В.

## МАРКЕТИНГ МУЗЕЕВ БЕЛАРУСИ: РАЗРАБОТКА ПЕРСПЕКТИВНОГО ПЛАНА

Активное сокращение государственного финансирования в сфере культуры и снижение числа посетителей в связи с экономическим кризисом, сложно переживаемым населением страны, а так же тот факт, что европейские тенденции в продвижении деятельности музеев существенно отличаются от отечественной практики, повлекло за собой ряд противоречий в деятельности музеев, которые необходимо решать в ближайшем будущем.

Модернизация и оптимизация деятельности музее в рамках Государственных программ развития культуры других законодательных документов в музейной сфере в последние годы привела и к тому, что постепенно отечественные государственные музеи обратили больше внимание на свою маркетинговую и рекламную деятельность. Обновление стратегий привнесло в традиционный музейный язык новые понятия, такие как арт-рынок, музейный менеджмент, выставочный маркетинг и другие дефиниции, которые на практике обозначают виды деятельности, способствующие эффективной организации современного музейного дела и управлению музейной деятельностью [2]. На базе государственных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ